

*Вясёлыя танцы на каляднай імпрэзе.*

# Беларускія Каляды. Вільня

Студэнты кафедры этналогіі і фальклору БДУКіМ павіншавалі з Калядамі выкладчыкаў і вучняў Вільнюскай гімназіі імя Францыска Скарыны, дзе навучанне вядзецца на беларускай мове.

Прывітанне гаспадарам дома, ваджэнне казы, пажаданні здароўя і дабрабыту на ўвесь год, вясёлыя танцы і гульні — усе гэтыя элементы традыцыйных беларускіх Каляд былі захаваныя ў тэматычным прадстаўленні. Адзінае адрозненне — домам стала школьная зала, гаспадарамі — настаўнікі, а членамі вялікай і дружнай сям'і — вучні. Ды агульнай атмасферы Каляд гэтая змена роляў ніяк не пашкодзіла. Настаўнікі з радасцю віталі гасцей, дзеці спявалі ўжо вядомыя ім песні «Лявоніха» і «Юрачка», танцавалі Картузэ, вадзілі вялікі карагод.

— Свае калядныя праграмы мы са студэнтамі — будучымі этнафоназнаўцамі — прадстаўляем у гэтай гімназіі ўжо шмат гадоў, — распавёў загадчык кафедры этналогіі і фальклору БДУКіМ Вячаслаў Калацэй. — Што тут заўсёды сустракаюць з радасцю. Дзеці ўжо ведаюць некаторыя песні, ахвотна далучаюцца да танцаў і карагодаў. Ім цікава быць удзельнікамі свята, слухаць спевы, знаёміцца з гучаннем новых музычных інструментаў.

Беларускія Каляды для літоўскіх школьнікаў, якія вучацца на беларускай мове, — магчымасць далучыцца да традыцыйнай культуры беларусаў, а таксама пашырыць уласныя веды пра нашу краіну. Сёлета асаблівую ўвагу навучэнцаў звярнулі на сябе гліняны гляк (адметны народны інструмент) і, натуральна, сімвал бягучага года па кітайскім календары — Каза.

**Марына ВЕСЯЛУХА, фота аўтара**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ